## *Паважаныя бацькі і педагогі!*

Стварыце цікавую і добразычлівую атмасферу. Не вымушайце дзіця выконваць заданні без яго жадання. Прапануйце яму адгадваць загадкі, развучваць вершыкі, лічылкі, маляваць карцінкі. Займайцеся заўсёды разам — радуйцеся поспехам і пераадольвайце няўдачы. У час гульняў-заняткаў, працягласць якіх не павінна перавышаць 20 хвілін, падкрэслівайце і тлумачце дзіцяці розніцу паміж літарай і гукам (мы вымаўляем гукі, а бачым і пішам літары). Вучыце правільна вымаўляць спецыфічныя для беларускай мовы гукі падчас прагаворвання вершаў, загадак, скарагаворак і чыстагаворак. Работа над гукавым аналізам слова даволі цяжкая, патрабуе шмат ведаў і ўвагі. Вучыце выдзяляць галосныя і зычныя гукі. Падзяляць зычныя гукі на цвёрдыя (вялікі братка) і мяккія (малы братка), падзяляць словы на склады, вызначаць націскны галосны гук. Выкарыстоўвайце каляровыя алоўкі для гукавога аналізу: чырвоны — галосны гук, сіні — зычны цвёрды, зялёны — зычны мяккі.

Не стрымлівайце дзіця, калі яно хоча намаляваць нешта сваё, для яго цікавейшае. Але абавязкова ўдакладніце, чаму менавіта так яно вырашыла зрабіць.

Заданні могуць выконвацца паступова, улічваючы індывідуальныя магчымасці дзіцяці.

Вучыце дзіця разумець родную беларускую мову і размаўляць на ёй.

# САДАВІНА І ГАРОДНІНА. БЕЛАРУСКАЯ НАРОДНАЯ КУХНЯ

**1 «Школа Бусліка».**

Намалюйце ў кошыку з літарай, якая абазначае галосны гук, — яблыкі, з літарай, якая абазначае зычны гук, — грушы.




**2 Гукавы аналіз слова.**

Упішыце слова **САД** у клетачкі і зрабіце гукавы аналіз слова: замалюйце галосны гук — чырвоным колерам, зычныя цвёрдыя — сінім.

| | | |
|---|---|---|
| | | |



**3** **«Урокі Моваведкі».**

Назавіце правільна гародніну, пры вымаўленні сілай голасу выдзеліце ў словах гукі **[г]**, **[р]**.

Замалюйце фіялетавым колерам кружок, калі ў слове ёсць гукі **[г]**, **[р]**; аранжавым — калі ў слове ёсць толькі гук **[г]**, ружовым — калі ў слове ёсць толькі гук **[р]**.

Дамалюйце гародніну, у назвах якой таксама ёсць гукі **[р]**, **[г]**.



# БЕЛАРУСКАЯ НАРОДНАЯ ТВОРЧАСЦЬ

**1 «Урокі Моваведкі».**

Адкажыце: хто як крычыць? Разам з дарослым прачытайце словы. Злучыце лініяй героя і адпаведныя словы.





Ко-ко-ко! Мяў-мяў! Ку-ка-рэ-ку! Га-га-га! Пі-пі-пі!




**2 Гукавы аналіз слова.**

Упішыце слова **КОТ** у клетачкі і зрабіце гукавы аналіз слова: замалюйце галосныя гукі — чырвоным колерам, зычныя цвёрдыя — сінім.

| | | |
|---|---|---|
| | | |

Разам з дарослым вывучыце беларускую народную забаўлянку:

Раз, два, тры, чатыры,
Ката грамаце вучылі,
Не чытаць, не пісаць,
А за мышкамі скакаць.

# НАСЯКОМЫЯ. КВЕТКІ

**1 «Урокі Моваведкі».**

Прачытайце разам з дарослым беларускую народную загадку. Намалюйце адгадку.

Чорны, ды не воран,
Рагаты, ды не бык,
Шэсць ног без капыт,
Ляціць — вые,
Сядзе — зямлю рые. (Жук.)

Прачытайце разам з дарослым чыстагаворкі. Правільна вымаўляйце беларускі гук **[ж]**. Назавіце словы, у якіх ёсць гук **[ж]**. Абвядзіце літару і замалюйце яе.

Жабка збірае журавіны,
Жменькай закідае ў жбан...
*У. Ліпскі*

Жоўты жук жалеза рэжа.
*П. Міська*




**2 Гульнёвае практыкаванне «Складзі букет з гукаў».**

Разгледзьце ўважліва літары ў кветках. Складзіце з іх словы. Злучыце літары ў патрэбным парадку. Прачытайце разам з дарослым, якія назвы кветак атрымаліся. Размалюйце блакітным колерам самае доўгае слова, чырвоным — самае кароткае слова.



**3** **«Школа Бусліка».**

***Графічнае практыкаванне «Вусень».*** По клетках намалюйце роўненькія кружочкі, каб атрымаўся вусень. Расфарбуйце колерамі вясёлкі.



* Размалюйце малюнак і складзіце расказ «На лузе».



# ЗМЕСТ

*Ад аўтараў* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 1
*Картка-заданне 1.* Сям'я . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 2
*Картка-заданне 2.* Садавіна і гародніна. Беларуская народная кухня . . . . . . . 4
*Картка-заданне 3.* Беларуская народная творчасць . . . . . . . . . . . . . . . . 6
*Картка-заданне 4.* Беларусь — гэта мы! Наша краіна . . . . . . . . . . . . . . . 8
*Картка-заданне 5.* Святы. Традыцыі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 10
*Картка-заданне 6.* Цацка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 11
*Картка-заданне 7.* Птушкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 12
*Картка-заданне 8.* Бібліятэка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 14
*Картка-заданне 9.* Адзенне, абутак . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 16
*Картка-заданне 10.* Зіма. Зімовыя гульні . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 18
*Картка-заданне 11.* Дзень абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 20
*Картка-заданне 12.* Беларускія народныя музычныя інструменты . . . . . . . . . 21
*Картка-заданне 13.* Дзень жанчын — 8 Сакавіка. Жаночыя прафесіі . . . . . . . . 23
*Картка-заданне 14.* Сакавік. Вясна. Пералётныя птушкі . . . . . . . . . . . . . 25
*Картка-заданне 15.* Будоўля. Архітэктура. Дызайн . . . . . . . . . . . . . . . . 27
*Картка-заданне 16.* Свойскія жывёлы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 29
*Картка-заданне 17.* Вясновыя святы. Дзень Перамогі . . . . . . . . . . . . . . . 31
*Картка-заданне 18.* Насякомыя. Кветкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 33
*Літаратура* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 35

Зак. 234/2713320-1.